## Бабіна лета

*Рыгор Ігнаценка*



Другі тыдзень запар ідзе дождж. Цярушыць і цярушыць, быццам праз сіта. А то часам і ветрам пацягне, ды такім халодным, што пальцы пачынаюць дубець. Здаецца, яшчэ тыдзень-другі — і на змену дажджу пасыплецца снег, ляжа на зямлю мяккім пухам.

Але зусім нечакана дождж перастаў ісці. Выбліснула сонейка. І ўсё навокал ажыло і павесялела... Дні стаяць ціхія, сонечныя, поўныя мяккай задуменнасці і хараства. У паветры плавае павуцінне. Тонкія серабрыстыя валаконцы асядаюць на зямлю, чапляюцца за хмызы, платы, быльнёг. Зямля набывае матава-белы колер, а валаконцы ўсё ткуцца. Паглядзіш у бязмежнае блакітнае асенняе неба і раптам падасца, быццам вось-вось з яго зараз сыпануцца на зямлю чароўныя песні палявых жаваранкаў.

«Бабіна лета настала», — з замілаваннем кажуць у народзе аб гэтай пары восені.

Адчуўшы цяпло, ажываюць шматлікія заснуўшыя было на зіму насякомыя. Зноў з’яўляюцца стракатыя матылькі, мітусяцца ля чыстых люстраных лужын на лясных дарогах хуткакрылыя стракозы, вылазяць з хадоў-лабірынтаў пагрэцца на сонейку лясныя мурашкі. А часам нават прагудзе над адзінокай кветкай калматы чмель, забалбоча на ўзлессі цецярук-касач.

Нішто жывое не траціць цяпер дарэмна гэтых апошніх залатых дзянькоў. Хто прадбачліва назапашвае



Правообладатель Академия образования

на зіму карми́, хто спяшаецца цёплае жыллё ўладкаваць, хто проста жыруе, набіраецца сілы.

Большасць птушак ужо адляцела. Ранкамі ў асеннім небе можна пачуць толькі трубныя галасы апошніх жураўоў. Гэта журботнае курлыканне крылатых вандроўнікаў нельга слухаць без хвалявання. І наўрад ці знойдзецца чалавек, які, пачуўшы гэтыя развітальныя крыкі ў небе, не падыме галавы, не праводзіць жураўоў доўгім позіркам.

Але кароткія яны, гэтыя залатыя дзянькі бабінага лета. Глядзіш — зноў схавалася за хмары сонца, падзьмулі вятры, зачасцілі дажджы. І зноў пахаваліся кудысьці падманутыя цяплом усялякія кузуркі, стракозы, мурашкі. У лесе стала ціха і няўтульна.

Бывай, залатая восень!

1. Што вы даведаліся пра бабіна лета? Назавіце прыкметы асенняй з’явы, карыстаючыся тэкстам.
2. Як рэагуюць жывыя насельнікі прыроды на дні бабінага лета? Падмацуйце адказ радкамі твора.
3. Якія пачуцці хацеў перадаць чытачу пісьменнік, апісваючы адлёт жураўлёў?
4. Падумайце, з якой мэтай аўтар апісаў асеннюю з’яву прыроды — бабіна лета.
5. Вызначце, колькі сэнсавых частак у тэксце. Дайце ім загалоўкі.

**Творчае заданне.** Калі вы валодаеце здольнасцямі маляваць, то праілюструйце некаторыя эпізоды апісання восені ў апавяданні «Бабіна лета» Рыгора Ігнаценкі. Пры неабходнасці скарыстайце памятку 2 (форзац 1).

***Маўленчая размінка.*** Пры чытанні верша і загадкі правільна вымаўляйце гукі [дз’], [г], [ў] і падоўжаны [л’].



### Завіруха

Вецер **г**рае на дудзе,
Аж прастор увесь **г**удзе.
Пад такі шалёны **г**рай
Скача бор і скача **г**ай,
Наваколле сто**г**не **г**луха —
Баль спраўляе завіруха.

*Аляксей Бібіцкі.*



Яна зімой ваўчыцай злой
У полі вые **г**луха,
Ты зда**г**адаўся, дружа мой,
Што **г**эта?

*Міхась Пазнякоў.*

**Успомніце.** Прачытайце вершы пра зіму, якія вы раней вучылі на памяць. Якім настроем яны прасякнуты? Чаму?

**До́світак** — час перад світаннем.
**Ляжа́нка** — шырокі выступ печы для ляжання і ацяплення.
**Дэкламава́ць** — выразна, па-майстэрску чытаць мастацкі твор на памяць.
**Ле́тась** — у мінулым годзе, мінулым летам.
**Бра́ма** — уваход у двор; крытыя зверху вароты.
**Аблаву́шка** — зімовая шапка, вушанка.



Правообладатель Академия образования